# Да 90-годдзя МДУ імя А.А.Куляшова

## ПЕРШЫЯ ВЫКЛАДЧЫКІ І НАСТАЎНІКІ Ў ГІСТОРЫІ МАГІЛЁЎСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя А.А. КУЛЯШОВА

Пачатак мінулага стагоддзя быў часам хуткага пашырэння колькасці пачатковых школ у Расійскай імперыі, што выводзіла пытанне паляпшэння сістэмы падрыхтоўкі настаўнікаў у разрад першачарговых. Летам 1913 г. было прынята рашэнне адкрыць 1 ліпеня настаўніцкі інстытут і ў г.Магілёве. Магілёў стаў прыкладна 30-м горадам імперыі, які меў настаўніцкі інстытут.

Дырэктарам настаўніцкага інстытута быў прызначаны стацкі саветнік У.М.Тычынін, які энергічна пачаў фарміраваць штат інстытута і стварыць яго матэрыяльную базу. 1 кастрычніка 1913 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё інстытута. Ён павінен быў рыхтаваць настаўнікаў для вышэйшых пачатковых вучылішчаў і лічыўся сярэдняй навучальнай установай з трохгадовым тэрмінам навучання. Пры інстытуце было створана двухкласнае гарадское вучылішча, у якім студэнты праходзілі педагагічную практыку. Так пачалася гісторыя навучальнай установы, якая сёння з гонарам носіць званне універсітэта.

Ва ўсі часы гісторыя здзяйсняецца людзьмі. Таму так важна ўгледзіцца ў лёсы тых, з каго ўсё пачыналася. Асабовы састаў служачых у інстытуце ў 1913 г. складаў 14 чалавек, сярод якіх: 1 – дырэктар, 1 – законанастаўнік, 4 – выкладчыкі навук, 1 – чарчэння і малявання, 1 – спеваў, 1 – гімнастыкі, 1 – ваеннага строю, 2 – настаўнікі вучылішча, 2 – іншых. З дзевяці выкладчыкаў шэсць мелі вышэйшую адукацыю [9, арк.10, 21]. Іх прозвішчы і кароткія біяграфіі трэба прывесці па праву першых.

У адпаведнасці з даведкай для "Памятной книжки Виленского учебного округа на 1913 – 1914 уч. год" дырэктар інстытута, стацкі саветнік, кандыдат маскоўскай духоўнай акадэміі Уладзімір Мікалаевіч Тычынін у 1913 г. з'яўляўся чыноўнікам 5 класа. На службу ён паступіў яшчэ 14 студзеня 1889 года і быў за яе ўзнагароджаны ардэнамі св. Ганны 2-й і 3-й ступеняў, св.Станіслава 2-й і 3-й ступеняў, бібліяй ад Святога Сіноду, залатым знакам Чырвонага крыжа, залатым і бронзавым знакамі Імператарскага Палестынскага праваслаўнага таварыства, срэбнай медалью ў памяць царствавання Імператара Аляксандра III і срэбнай медалью ў памяць 25-ці годдзя Імператара Мікалая II [8, арк.1]. У інстытуце Уладзімір Мікалаевіч выкладаў педагогіку. Да рэвалюцыі ён быў даволі вядомым на Беларусі педагогам, неаднойчы друкаваўся ў спецыяльных педагагічных часопісах, лічыўся прадстаўніком "прагрэсіўнай педагогікі" [23, с. 99, 121].

Першым законавучыцелем інстытута быў прызначаны свяшчэннік Мікалай Азар'евіч Гамолка. У 1901 г. ён скончыў курс С.-Пецярбургскай духоўнай акадэміі з ступенню кандыдата багаслоўя "з правам палучэння ступені магістра багаслоўя без новых вусных іспытаў". У гэтым жа годзе М.Гамолка стаў памочнікам інспектара ў Магілёўскай духоўнай семінарыі, а з 1903 г. выкладаў матэматыку і фізіку ў Магілёўскім жаночым духоўным вучылішчы. Ён быў жанаты, меў сына і дачку. Да моманту прыходу ў інстытут прайшоў шлях ад тытулярнага саветніка ў 1906 г., калежскага асэсара ў 1909 г., да надворнага саветніка ў 1910 г. і быў узнагароджаны ардэнамі св. Ганны 3-й ступеняў і св.Станіслава 3-й ступеняў. Законавучы-

целем ён быў прызначаны пры ўмове прыняцця свяшчэннага сану. Фактычна Гамолка быў другой асобай у інстытуце. На час адлучак Тычыніна менавіта ён выконваў у 1913 – 1914 гг. абавязкі дырэктара. У ліпені 1914 г. па яго просьбе ён быў пераведзены ў Мінскі настаўніцкі інстытут [6, арк.43 – 66; 8, арк.2].

У лістападзе 1914 г. папячыцель Віленскай вучэбнай акругі часова прызначыў выкладаць "Закон Божы" ў настаўніцкі інстытут выкладчыка Магілёўскай духоўнай семінарыі свяшчэнніка Васіля Маркава, а ў гарадскае пры інстытуце вучылішча свяшчэнніка Вазнясенскай царквы Пятра Дамарацкага, якія і працавалі на гэтых пасадах да жніўня 1916 г. [15, арк.3 – 4].

Рускую мову ў інстытуце выкладаў надворны саветнік кандыдат багаслоўя Маскоўскай духоўнай акадэміі, чыноўнік 8-га класа Віталій Паўлавіч Сакалоў. Ён паступіў на службу 26 жніўня 1909 года і да інстытута працаваў у Мінскай духоўнай семінарыі. Выкладчыкам матэматыкі быў Яўген Сямёнавіч Аляхновіч – праваслаўны, 8-га класа чыноўнік, які скончыў курс навук па матэматычнаму аддзяленню фізіка – матэматычнага факультэта С. – Пецярбургскага універсітэта і 1 жніўня 1913 г. паступіў на службу. Гісторыю і геаграфію пачаў выкладаць калежскі асэсар Міхаіл Рыгоравіч Руднеў. Праваслаўны па веравызнанню ён скончыў курс па гістарычнаму аддзяленню гісторыка – філасофскага факультэта Юр'еўскага універсітэта і з 16 верасня 1910 г. паступіў на службу [6, арк.18; 8, арк.2].

Пасада выкладчыка прыродазнаўства і фізікі на пачатак навучальнага году была яшчэ вакантна. Але, 25 кастрычніка 1913 г. яна была занята Я. І. Тэадаровічам. Якаў Іванавіч скончыў Кіеўскую духоўную семінарыю ў 1877 г. і паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Новарасійскага універсітэта. Служба ў пяхотным палку не перашкодзіла здачы маладым чалавекам экзаменаў ва універсітэце на званне настаўніка гімназіі. З 1882 г. Тэадаровіч працаваў настаўнікам настаўніцкай семінарыі, а з 1892 г. інспектарам народных вучылішч Екацерынаслаўскай губерні. За службу інспектар быў узнагароджаны ардэнамі св. Ганны 3-й ступеняў і св.Станіслава 2-й і 3-й ступеняў. Пасля выхаду ў адстаўку ў 1907 г. Якаў Іванавіч атрымоўваў пенсію ў 900 руб.у год і працаваў настаўнікам у прыватных гімназіях. У сувязі з прыняццем на працу ў Магілёўскі інстытут Я. І. Тэадаровіча "адазвалі на 5 год з адстаўкі" [13, арк.1 – 47].

У першыя гады істотную дапамогу ў выкладанні розных прадметаў аказалі выкладчыкі Магілёўскай мужской гімназіі. Лютэранін Міхаіл Маісеевіч Родзін працаваў па найму выкладчыкам рысавання і чарчэння. Сямён Сцяпанавіч Палуянаў і Франк Іванавіч Стангль вучылі адпаведна спевам і гімнастыцы. Ваенны строй і ваенную гімнастыку ў інстытуце выкладаў паручнік Іван Іванавіч Емельянаў. Камандзір 159-га пяхотнага гурыйскага палка характарызаваў яго так: "...гімнастыку знае цудоўна, афіцэр выдатны і 3-й год састаіць узводным камандзірам вучэбнай каманды" і даў згоду на працу ў інстытуце, пры ўмове, што яна не будзе замінаць службе [8, арк.2; 10, арк.1 – 5].

Першым пісьмаводам і эканомам інстытута стаў Міхаіл Карпавіч Міхаленка – чыноўнік 10-га класа, які служыў з 1913 г. Доўгі час школьным доктарам інстытута быў калежскі саветнік Міхаіл Іванавіч Галынец. У гарадскім пры інстытуце вучылішчы працавала 2 настаўнікі. Былы настаўнік Юрбургскага гарадскога вучылішча Яфрэм Фёдаравіч Жыхараў нарадзіўся ў 1883 г., скончыў Полацкую настаўніцкую семінарыю, Віленскі настаўніцкі інстытут, паступіў на службу ў 1912 г., быў чыноўнікам 10 – класа і вучыў навучэнцаў рускай мове, геаметрыі, гісторыі і чыстапісанню. Выпускніком таго ж інстытута быў і Мітрафан Мікалаевіч Пігулеўскі, таксама чыноўнік 10-га класа. Ён паступіў на службу 16 ліпеня 1913 года. У сувязі з залічэннем новых класаў пазней на працу быў прыняты яшчэ адзін настаўнік – Іван Якаўлевіч Бабарыка [8, арк.2; 11, арк.39].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Усе настаўнікі, што працавалі на стаўку ў інстытуце, відаць былі добрымі спецыялістамі і задавальнялі адміністрацыю. У імянных спісах 1914 і 1916 гг. "наяўнага саставу служачых, якія ў выпадку заслугі маглі атрымаць узнагароду" значацца выкладчыкі Я.С.Аляхновіч, В.П.Сакалоў, М.Р.Руднеў. У падобныя спісы ўключаліся настаўнікі Я.Ф.Жыхараў і М.М.Пігулеўскі, школьны доктар М.І.Галынец і пісьмавод М.К.Міхаленка. У 1914 г. у ім фігураваў Я.І.Тэадаровіч, а ў 1916 г. выкладчык графічных мастацтваў Фёдар Рыгоравіч Пархоменка, які закончыў Акадэмію мастацтваў у Петраградзе. Якасны склад педкалектыва не павінен здіўляць. З прашэннямі аб прыёме на працу ў інстытут звярталіся настаўнікі і выкладчыкі Магілёўскай і Мінскай духоўных семінарый, Уфімскай і Рэжыцкай мужчынскіх гімназій, Усвятскага і Магілёўскага гарадскіх вучылішч ды многіх іншых навучальных установ [6, арк.18 – 22; 7, арк.12 – 17, 32, 38]. Некаторыя з выкладчыкаў мелі вопыт замежных стажыровак. Так, Ф.Стангль курсу "сакольскай гімнастыцы" навучаўся ў г.Празе і меў сямігадовы вопыт яе выкладання [12, арк.7].

Працы выкладчыкаў спрыялі і адносна высокія заробкі ў супрацоўнікаў інстытута. Дырэктар атрымоўваў 2400 руб. (1200 руб. – жалаванне, 800 руб. – сталовыя і 400 руб. дадатковага ўтрымання ) у год і кватэрныя. Законанастаўнік і выкладчыкі навук – па 1440 руб. (650 руб. – жалаванне, 550 руб. – сталовыя і 240 руб. дадатковага ўтрымання ) [9]. Для параўнання: сярэдні заробак па Магілёўскай губерні ў 1913 г. склаў 198 руб. 11 к., а па Беларусі – прыблізна 210 руб. у год. Аклад выкладчыкаў у месяц складаў 120 руб., у той час як рабочыя атрымлівалі 30-40 руб., машыністы паравозаў да 80 руб. у месяц [22, с.45-47].

Астатнія настаўнікі працавалі на розных умовах, у тым ліку на частку стаўкі, і мелі заробкі ад 120 да 780 руб. у год. Выкладчык спеваў атрымоўваў у 1913 – 1914 нав. годзе 360 руб., рысавання і чарчэння па 240 руб., а гімнастыцы і ваеннага строю па 120 руб. гадавых. Яны працавалі па найму за ўзнагароджанне з разліку 60 руб. за гадавы урок. Пісьмавод атрымоўваў 300 руб. у год, меў даплату 30 руб. і інстытуцкую кватэру, а таксама заробак эканома роўны 400-м руб. Настаўнікі гарадскога пры інстытуце вучылішча мелі заробак 780 руб. (450 руб. – жалаванне, 200 руб. – сталовыя і 130 руб. дадатковага утрымання) у год; [5, арк.60; 8, арк.2; 9]. Яны пражывалі ў інстытуцкіх кватэрах, якія, дарэчы, былі не надта добраўпарадкаванымі. Дырэктар быў вымушаны часта звяртацца да домаўласнікаў з патрабаваннем ліквідацыі недаробкаў, рамонта водаправода і г.д. [4, арк.48, 101].

Выкладчыкі бясплатна праводзілі выхаваўчую работу, выконвалі бібліятэкарскія, сакратарскія абавязкі, дзяжурылі па інстытуту. Яны, як і студэнты, жылі на прыватных кватэрах, а самае галоўнае, атрымлівалі заробкі значна меншыя, чым у іншых сярэдніх навучальных установах (гімназіях, напрыклад). Горшае чым у сваіх калег матэрыяльнае становішча нараджала моцнае жаданне пабочных даходаў, якое было "амаль нястрымным". Шмат хто з супрацоўнікаў падпрацоўваў ў іншых навучальных установах. Так, у 1916 г. настаўнік матэматыкі, напрыклад, атрымаў у інстытуце 1800 руб. за год і 770 руб. у жаночым вучылішчы. Шукалі падпрацоўкі і іншыя выкладчыкі, нягледзячы на павышэнне ў 1916 г. дадатковага ўтрымання амаль на 200 руб. у настаўнікаў [6, арк.2; 11, арк.14, 40].

Ня дужа бліскучым лічыў сваё становішча і дырэктар інстытута У.М.Тычынін. У 1915 г. ён ад імя калектыва Магілёўскага інстытута рабіў даклад аб шляхах рэфармавання і паляпшэння дзейнасці настаўніцкіх інстытутаў і так ацэньваў суадносіны абавязкаў і ўзнагароджання дырэктара інстытута [14, арк. 58Аб]:

"Директор института, неся, помимо обязанностей и ответственности этой службы, обязанности инспектора института и городского училища, преподавателя института по всем философским и педагогическим дисциплинам, по заведыванию обширной для педагогического учреждения канцелярией, щепетильными

по многосторонней отчетности и контролю хозяйством, обязанный быть везде, стоять в центре, за все отвечать по двум учебным заведениям, по необходимости работать и заботиться по не входящим в обязанности директора института делам, при необходимости представительствовать, с служебными поездками, чаще всего человек далеко не начинающий лишь службу – вознаграждается 2000 руб. в год."

Адкрыццё Магілёўскага настаўніцкага інстытута стала значным крокам у паляпшэнні падрыхтоўкі педагагічных кадраў, важным фактарам грамадскага жыцця рэгіёна. У 1916 г. на сучаснай тэрыторыі Беларусі працавалі 3 настаўніцкія інстытуты (187 навучэнцаў), 9 настаўніцкіх семінарый (каля 1000 навучэнцаў), 7 двухгадовых педагагічных курсаў (288 навучэнцаў) [18, с. 385]. Колькасць кваліфікаваных настаўнікаў пачала пастулова павялічвацца.

У інстытуце , як у любым калектыве, сітуацыя не магла быць ўвесь час ідэальнай. Здараліся і канфліктныя сітуацыі. У 1915 г. на выкладчыка Я.І.Тэадаровіча паступіла ў канцылярыю Папячыцеля вучэбнай акругі калектыўная скарга выхаванцаў Магілёўскага настаўніцкага інстытута. Сутнасць гэтай скаргі нам пакуль невядома, але з матэрыялаў, якія захаваліся ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, бачна , што Тычынін спачатку спрабаваў замяць справу. А пасля патрабавання Папячыцеля акругі В.Р.Аляксеева адказаць на скаргу па сутнасці справы – гэта значыць "аб педагагічнай дзейнасці выкладчыка Тэадаровіча", апошні заявіў аб "экстрэным ад'езде з Магілёва па абставінах экстрэнага характара", і быў тэрмінова пераведзены ў Бендэрскае рэальнае вучылішча [13, арк. 34, 47-51].

У жніўні 1914 г. Папячыцелем акругі быў вызвалены ад выкладання гімнастыкі Ф.Стангль. Прычыны гэтага здарэння былі ўжо не ўнутранымі, а міжнароднымі. Пачатак Першай сусветнай вайны, ці, як яе тады называлі, "Другой айчыннай вайны", выклікаў у Расійскай імперыі не толькі хвалю патрыятычных малебнаў, сходаў і маніфестацый, але і хвалю шпіёнаманіі і пагромаў нямецкіх, а часцяком, як звычайна, і яўрэйскіх, гандлёвых і прамысловых прадпрыемстываў. Франк Стангль быў адхілены ад выкладання па этнічных і рэлігійных прычынах. Кіраўніцтву інстытута было прапанавана знайсці да заканчэння высвятлення становішча Стангля асобу праваслаўнага веравызнання для заняткаў гімнастыкай. Не дапамагалі нават бліскучыя характарыстыкі з вучэбных устаноў, дзе выкладчык раней працаваў. Дырэктар Аляксандраўскага Магілёўскага рэальнага вучылішча характарызаваў яго так: "...добра ведае сваю справу, цалкам дабрасумленна адносіцца да сваіх абавязкаў і ў маральных адносінах не заслугоўвае ніякіх папрокаў". А дырэктар "Магілёўскай мужчынскай Імператара Аляксандра І Благаславеннага гімназіі" пісаў: "...цудоўных маральных якасцей..., на службе ў вышэйшай ступені выканаўчы і акуратны. Прадмет свой ведае выдатна..." Праўда, кіраўніцтва акругі падсказала У.Тычыніну, што пасля прыняцця Станглем рускага падданства інстытут можа "зноў выйсці з пытаннем аб прызначэнні на пасаду..." Гэта і было зроблена восенню, і ў лістападзе 1914 г. Ф.Стангль было дазволена прыступіць з 1 студзеня 1915 г. да ўрокаў [12, арк.8 – 11].

У гады вайны інстытут меў цяжкасці з наборам студэнтаў і памяшканнем. Частка студэнтаў і выкладчыкаў была мабілізавана на фронт. Быў прызваны і настаўнік гарадскога пры інстытуце вучылішча Я.Жыхараў. Ён служыў пісарам ва ўпраўленні каменданта Галоўнай кватэры Вярхоўнага Галоўнакамандуючага і ў 1917 г. "за отлично – усердную и особо ревностную службу и труды понесенные во время боевых действий" быў узнагароджаны срэбнай медаллю з надпісам "За усердие" для нашэння на Станіслаўскай стужцы. Пасля дэмабілізацыі ў студзені 1918 г. Я.Жыхараў быў зноў залічаны ў штат настаўнікам вучылішча і з 1 студзеня выконваў абавязкі сакратара педсавета інстытута [11, арк. 11].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Велізарныя намаганні, самаадданая праца супрацоўнікаў дазволіла інстытуту не прыпыніць сваёй дзейнасці ні ў рэвалюцыйных умовах 1917 г., ні пад час грамадзянскай вайны. Набор 1917 г. ішоў па адпрацаванай раней схеме. У студзені 1918 г. заняткі ў інстытуце аднавіліся. У 1918 г. Магілёў быў заняты спачатку польскімі, а потым германскімі ўзброенымі фарміраваннямі. У складанай ваенна-палітычнай і эканамічнай сітуацыі кіраўніцтва інстытута рабіла ўсё магчымае, каб інстытут жыў. Вырашаліся і кадравыя праблемы. У інстытут не вярнуліся настаўнікі М.Пігулеўскі і М.Бабарыка. У верасні 1918 г. памёр выкладчык гісторыі, геаграфіі і палітэканоміі М.Руднеў. Замест яго ў штат быў прыняты Яўген Іосіфавіч Бычкоў, які ў будучым стане наступным кіраўніком інстытута. Пасля ўступлення ў Магілёў 31 кастрычніка 1918 г. войск Чырвонай Арміі і пераходу ўлады да губернскага рэвалюцыйнага камітэта дзейнасць інстытута каардынавалася ўжо з ім.

Напрыканцы 1918 года Магілёўскі настаўніцкі інстытут быў пераўтвораны ў педагагічны – вышэйшую навучальную ўстанову з чатырохгадовым тэрмінам навучання. У склад яе супрацоўнікаў увайшлі лепшыя выкладчыкі былога настаўніцкага інстытута, навучальных устаноў горада Магілёва, а таксама спецыялісты з розных гарадоў Расіі, у тым ліку і сталічных, напрыклад: С.В.Галынскі з Маскоўскай Пятроўска-Разумоўскай Акадэміі, доктар філасофіі С.В.Марголін ды іншыя. Рабіліся спробы набыць новае абсталяванне, метадычныя дапаможнікі і літаратуру; расла колькасць слухачоў.

У 1919 г. у Маскве было прынята рашэнне аб чарговай рэарганізацыі: педагагічныя інстытуты пераўтвараліся ў інстытуты народнай адукацыі (ІНА). У адпаведнасці са статутам яны таксама адносіліся да вышэйшых навучальных устаноў. У кастрычніку 1919 г. Магілёўскі ІНА быў адкрыты з чатырма аддзеламі. Дзейнасцю інстытута кіраваў Савет установы. У яго ўваходзілі як выкладчыкі, так і абраныя прадстаўнікі студэнцкага калектыву. Старшынёй Савета быў Яўген Восіпавіч Бычкоў, а сакратаром – Петр Васільевіч Шымковіч. Савет прымаў рашэнні па ўсіх найважнейшых пытаннях жыцця ўстановы і абіраў праўленне, якое непасрэдна займалася справамі інстытута[16, с.51-60].

Штат інстытута значна павялічыўся. Усяго згодна спіса выкладчыкаў і служачых ў магілёўскім ІНА на пачатак 1921 г. было 58 супрацоўнікаў, сярод якіх 35 выкладчыкаў, з якіх 31 (88,6%) меў вышэйшую адукацыю або выраўнаваную да яе. Найбольш працавала выпускнікоў Петраградскага (7) і Маскоўскага (4) універсітэтаў, а ўсяго універсітэцкую адукацыю мела 15 выкладчыкаў. Працавалі таксама выпускнікі Дзямідаўскага ліцэя (2), Педагагічнага інстытута імя Шалапуціна, Акадэміі генеральнага штаба, Рыжскага політэхнічнага інстытута, Петраградскага гісторыка-філалагічнага інстытута, Акадэміі мастацтваў у Петраградзе, прыдворнай пеўчай капэлы ды інш. У ІНА выкладалі кандыдат эканамічных навук М.В. Юдзеніч, кандыдаты багаслоўя У.М. Тычынін і В.П. Сакалоў (навуковыя ступені двух апошніх ужо не адзначаліся ў анкетах і даведках). Вядомы беларускі гісторык, архівіст і археограф, удзельнік Усебеларускага кангрэса 1917 г. Д.І.Даўгяла кіраваў навуковай работай членаў беларускай культурна-навуковай асацыяцыі, якую стварылі пры інстытуце з гуртка "Асвета" [1, арк.22 – 23; 20, с. 35].

Доктар навук С.В. Марголін быў адным з самых прыметных выкладчыкаў інстытута, і тым не менш яго імя сёння практычна невядома на Магілёўшчыне. Нарадзіўся Саламон Іосіфавіч у 1877 г. у Магілёве. Скончыў Бярлінскі універсітэт і з 1905 г. актыўна друкаваўся ў яўрэйскіх рускамоўных выданнях па праблемах эканамічнага стану яўрэяў Расійскай імперыі. Пасля рэвалюцыі ў сувязі з харчовым крызісам у сталіцах многія вучоныя з'ехалі ў правінцыю. Так, у штаце інстытута з'явіўся "доктар філасофіі, публіцыст і аўтар шэрагу палітыка – эканамічных

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

даследаванняў" С.Марголін. Ён быў абраны ў склад Савета інстытута, чытаў лекцыі па палітычнай эканоміі і гісторыі сацыялізма. У 1921 г. быў абраны 20-цю галасамі супраць аднаго на кафедру народнай гаспадаркі [1, арк.9, 22 – 23, 27; 21, с. 222].

Лекцыі студэнтам чытаў і былы дырэктар Магілёўскага настаўніцкага інстытута У.М.Тычынін. У 1921 годзе з складу былых выкладчыкаў настаўніцкага інстытута працягвалі працу таксама Я.І.Бычкоў – дырэктар ІНА, В.П.Сакалоў, які стаў загадчыкам аддзялення, выкладчык малявання і лепкі Ф.Р. Пархоменка.

Змены ў заканадаўстве шырока адкрылі дзверы ВНУ для жанчын, якімі яны адразу сталі масава карыстацца. У інстытуце ў 1921 г. працавала 17 жанчын, што складала 29,3% ад агульнай колькасці супрацоўнікаў. Большасць жанчын працавала на шэраговых пасадах. Жанчыны складалі палову (11 з 22-х) тэхнічных работнікаў. Узняцца адразу па іерархіі выкладчыцкай, або адміністрацыйнай лесвіцы жанчынам, асабліва з улікам адсутнасці ў большасці супрацоўніц інстытута вышэйшай адукацыі, было нялёгка. Тым не менш 5 жанчын ужо працавалі выкладчыцамі, што складала 14,3% ад агульнага ліку выкладчыкаў. Па праву першых назавём іх імёны і адукацыю: Акімава В.І. – вышэйшыя жаночыя курсы Лесгафта ў Петраградзе; Арлова Антаніна Іванаўна – петраградскія жаночыя курсы; Бер Кацярына Мікалаеўна – вучылася ў сярэдняй школе; Залеская Соф'я Львоўна – ВНУ; Карагодзіна Вера Іванаўна – двухгадзічныя курсы пры Харкаўскім інстытуце [17]. Як бачам, ураўнаванне у правах мужчын і жанчын адразу адчыніла дзверы для апошніх у гэтай сферы дзейнасці.

Першую адміністрацыйную кар'еру сярод жанчын ў гісторыі МДУ зрабіла, па тых дакументах, што маюцца ў нас на сённяшні дзень, Арлова Ларыса Васільеўна. У свой час яна скончыла курс сярэдняй школы, вышэйшыя курсы Лехвіцкай Скален і вышэйшыя Сцебуцёўскія сельскагаспадарчыя курсы. Таму невыпадкова, калі ў пачатку 1921 г. Савет інстытута абмяркоўваў пытанне аб стварэнні навучальна-узорнай гаспадаркі ў в. Красніца Вендржскай воласці Магілёўскага павета, то Л.В. Арлову адзінагалосна абралі загадчыцай узорна-паказальнай фермы, якой яна з вялікім поспехам кіравала [17].

Пасля рэвалюцыі сярод студэнтаў і выкладчыкаў былога праваслаўнага інстытута з'явіліся асобы розных веравызнанняў і нацыянальнасцей. Так, у 1921 г. з 58 супрацоўнікаў працавала не менш шасці яўрэяў (10,3%). У іх ліку было два выкладчыкі: Саламон Марголін і Рыгор Каган, які ў свой час скончыў Рыжскі палітэхнічны інстытут [1, арк. 22-23].

З кастрычніка 1920 г. на кожнага выкладчыка быў заведзены "асобны сшытак", у якім яны павінны былі запісваць прачытаныя лекцыі і іх кароткі змест, а ў сувязі з недахопам лектараў і выкладчыкаў было вырашана не прытрымлівацца нормы нагрузкі ў 12, або 8 гадзін (для членаў прэзідыума Савета) у тыдзень. На практыцы гэта азначала вучэбную перагрузку выкладчыкаў і бясплатнае выкананне імі часткі вучэбных даручэнняў.

Інстытуцкага заробку на жыццё не хапала. Практычна ўсе выкладчыкі падпрацоўвалі ў іншых навучальных ці савецкіх установах, у тым ліку ў тэхнікумах, лекторыях, на курсах і г. д. [2, арк.14-18]. Як і ў іншых установах частку платы за працу супрацоўнікам выдавалі пайком, частку – грашыма. Большасць выкладчыкаў была мабілізаваная і на працу ў асветніцкія ўстановы Чырвонай Арміі, напрыклад, у чырвонаармейскі універсітэт 16-й арміі.

Сацыяльная няпэўнасць, цяжкасці жыцця ў прыфрантавым горадзе, бядотны матэрыяльны стан ды іншыя прычыны выклікалі вялікую рухомасць кадраў. Некаторыя выкладчыкі пакідалі інстытут нават без уведамлення адміністрацыі аб гэтым. У чэрвене 1921 г. адмовіўся працаваць у інстытуце выкладчык матэма-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

тыкі Міхаіл Васільевіч Захараў, а вось лектара хіміі, загадчыка хімічнай лабараторыі і скарбніка інстытута М. М. Пагарэцкага адпускалі з удзячнасцю Савета ІНА "За ревностное и добросовестное исполнение обязанностей и отношение к институту с пылкой любовью". Савету ІНА нярэдка даводзілася пераразмяркоўваць кафедры, запрашаць на вакансіі новых выкладчыкаў [1, арк.51].

Летам 1921 г. пачалася чарговая рэарганізацыя ў сістэме народнай адукацыі: Інстытуты Народнай Адукацыі (ІНА) пераўтвараліся або ў практычныя ІНА, або ў педагагічныя тэхнікумы. Гомельскія губернскія ўлады настойвалі на ўтварэнні ПІНА ў Гомелі, а магілёўскія ішлі ў іх на павадку. Па сутнасці, адзінай установай, якая напачатку рэарганізацыі выступіла супраць такога рашэння, быў Магілёўскі інстытут. Перспектыва пераўтварэння ўстановы ў тэхнікум не падыходзіла ні выкладчыкам, ні студэнтам. Пытанне неаднаразова ў чэрвені – кастрычніку абмяркоўвалася на яго Савеце, які прызнаў магчымым і неабходным існаванне ў Магілёве практычнага інстытута, інфармаваў аб гэтым цэнтральныя ўлады, запрашаў дэлегата "Цэнтра" ў Магілёў для азнаямлення з сітуацыяй на месцы. Заявы з просьбай перавесці іх у практычны інстытут народнай адукацы напісалі каля 200 студэнтаў. [1, арк.69 - 71].

Дзейнасць калектыва Магілёўскага інстытута прывяла да перамогі: ён выстаяў і застаўся існаваць ў Магілёве, а, напрыклад, Мінскі інстытут народнай адукацыі быў пераўтвораны ў педагагічны тэхнікум [3]. Але ўжо на наступным пасяджэнні 18 кастрычніка 1921 г. Савет інстытута адзінагалосна (!) хадайнічаў перад Губчэка аб вызваленні з-пад варты старшыні Савета інстытута Я.В. Бычкова. "Як незаменнага члена Савета, які адзін знаходзіўся ў курсе спраў фінансавага і вучэбнага характара". Матэрыялы справы нам, на вялікі жаль, пакуль недаступныя. Што стала падставай для арышту Я.В. Бычкова? Яго дзейнасць па захаванні інстытута ў Магілёве (што вельмі верагодна) ці нейкія іншыя прычыны, сказаць цяжка. Да гонару калектыва ІНА адзначым, што нягледзячы на арышт, на гэтым Савеце Я.В. Бычкоў быў абраны, так бы мовіць завочна, на тыя кафедры, на якіх ён раней планаваў працаваць [1, арк.72 - 73].

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны становішча вышэйшай школы не палепшылася. Востры фінансавы, сацыяльна-эканамічны крызіс, узросшыя тэмпы інфляцыі паставілі многія інстытуты на мяжу выжывання. У ліпені 1923 г. СНК СССР прыняў дэкрэт "Аб закрыцці і рэарганізацыі некаторых вышэйшых навучальных устаноў". Магілёўскі інстытут перадаў сваю матэрыяльную базу педтэхнікуму. Туды была пераведзена частка выкладчыкаў, студэнты падрыхтоўчага аддзялення і першага курса. Старшакурснікі атрымалі магчымасць працягнуць вучобу на педфаку Беларускага дзяржаўнага універсітэта [19, с. 12].

У самыя цяжкія гады грамадзянскай вайны калектыў інстытута працягваў падрыхтоўку педагагічных кадраў, а яго кіраўніцтва спрабавала захаваць кадры выкладчыкаў і нават развіваць матэрыяльную базу інстытута. Самаахвярная дзейнасць супрацоўнікаў інстытута, грамадскасці горада, пэўнай часткі мясцовых улад па стварэнні і захаванні вышэйшай навучальнай установы ў Магілёве ў тых найцяжэйшых умовах сацыяльных пераўтварэнняў, вайны, разрухі і сёння вартая павагі і перайманне.

*СПАСЫЛКІ*

1. Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. – ф. 60, воп. 1, спр. 970
2. Там жа. – спр.996
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.- ф.221, воп.2, спр.33
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.– ф.2258, воп.1, спр.1
5. Там жа – спр.2
6. Там жа – спр.8

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

7. Там жа – спр.10
8. Там жа – спр.13
9. Там жа – спр.18
10. Там жа – спр.25
11. Там жа – спр.26
12. Там жа – спр.31
13. Там жа – спр.32
14. Там жа – спр.36
15. Там жа – спр.37
16. ***Агееў А.Р.*** Да гісторыі дзейнасці інстытута народнай адукацыі ў Магілёве // Веснік МДУ імя А.А.Куляшова. – 2000. – № 1. – С.51-60
17. ***Агееў А.Р.*** Пачатак жаночай эмансіпацыі ў гісторыі магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зб. нав. прац удзельнікаў Трэцяй міжнар. навук. канф. "Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць" у 2-х ч. Ч.ІІ / Уклад.: ***І.А.Пушкін, В.В.Юдзін.*** – Магілёў, 2003. – С.15-17
18. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі (са старажытных часоў да 1917 года). – Мн., 1985
19. ***Бондаренко В.А.*** Могилевский государственный педагогический институт: Краткий очерк истории (к 60-летию основания). – Мн., 1978
20. ***Васілеўскі Ю.*** Да гісторыі Магілёўскага гуртка беларускай моладзі «Асвета» (1918 – 1923 гг. ) // Магілёўская даўніна. – 1996. – С.28-40
21. История Могилевского еврейства: Документы и люди: Науч.-попул. Очерки и жизнеописания. Кн. 1. – Мн.,2002
22. ***Маразевіч В.Л.*** Старонкі гісторыі Беларусі (канец XIX – пачатак XX ст.). – Магілёў, 1994
23. ***Снапкоўская С.В.*** Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі. – Мн., 1995

*А.Р. АГЕЕЎ*